# РЭФЕРАТ

Справаздача 89 с., 1 ч., 42 крыніцы

СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА, ЖАНР, ЖАНРАВАЯ РАЗНАВІДНАСЦЬ, ВОБРАЗ, ПСІХАСАЦЫЯЛЬНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ, САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ, МОЛАДЗЬ, ПРОЗА, ДРАМАТУРГІЯ

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца сацыяльна-культурныя арыенціры моладзі ў празаічных і драматычных творах канца XX – пачатку XXI стагоддзя.

Мэта – вызначэнне асаблівасцяў мастацкага асэнсавання сацыяльна-культурных арыенціраў моладзі ў сучаснай беларускай літаратуры.

Метадалогія і метады даследавання. Беларуская літаратура для моладзі разглядаецца на аснове сістэмнага падыходу да з’яў літаратуры, выкарыстоўваюцца гісторыка-функцыянальны, параўнальна-тыпалагічны, герменеўтычны, рэцэптыўна-камунікатыўны літаратуразнаўчыя метады пры аналізе з’яў, фактаў і твораў.

У працэсе працы выяўлены найбольш важныя сацыяльна-культурныя арыенціры моладзі ў творах А. Курэйчыка, С. Кавалёва, А. Бадака, В. Гапеева, А. Дзялендзіка, І. Мытько, П. Пражко, А. Федарэнкі, А. Бутэвіча і іншых.

У выніку даследавання ўпершыню ў творах сучасных пісьменнікаў асэнсаваны асаблівасці мастацкага адлюстравання праблем псіхасацыяльнай ідэнтыфікацыі, фарміравання маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры, здаровага ладу жыцця, патрыятычнага выхавання, полікультурнасці і інш.

Ступень укаранення – выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе БрДУ імя А.С. Пушкіна: пры падрыхтоўцы да лекцыйных і практычных заняткаў па курсах “Літаратура бліжняга замежжа”, “Гісторыя рускай літаратуры (канец XX–XXI ст.)”, “Дзіцячая літаратура (Беларуская дзіцячая літаратура)”.”Дзіцячая літаратура (Руская і замежная дзіцячая літаратура)”, “Методыка выкладання беларускай літаратуры” “Методыка выкладання рускай літаратуры”.